літаратуры. Кнігі пісьменніка выходзілі мільённымі тыражамі, пакараючы чытачоў інтрыгуючымі сюжэтамі і вострымі жыццёвымі тэмамі, перакладаліся на многія мовы свету, ператвараліся ў сцэнары кінафільмаў і тэатральных пастановак. Ён сам стаў не толькі народным пісьменнікам Беларусі, а сапраўды класікам нацыянальнай літаратуры XX стагоддзя яшчэ пры жыцці.

1. Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1995. – Т. 6. – С. 315–332.
2. Бельскі, А. Беларуская літаратура ў кантэксце традыцый і сучаснасці / А. Бельскі. – Мінск: Зміцер Колас, 2017. – С. 159–196.
3. Тычына, М. Усё чалавечае: развагі пра творчасць І. Шамякіна / М. Тычына // Роднае слова. – 2001. – № 1. – С. 8–14.

**УДК 821.161.3**

## НА ЗЯМЛІ НЕ ЗГАСНЕ СЛЕД (ДА 100-ГОДДЗЯ ІВАНА МЕЛЕЖА)

*Студэнт – Русецкі І.А., 46 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Занкавіч А.П., канд. філал. навук, дацэнт*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны*
*ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле раскрываецца жыццёвы і творчы шлях Івана Мележа. Асноўнае месца ў творчасці Івана Мележа займае трылогія “Палеская хроніка” (“Людзі на балоце”, “Подых навальніцы”, “Завеі, снежань”). У творы апісана жыццё палескай вёскі 1920–1930-х гадоў.

**Ключавыя словы:** творчасць, зборнік апавяданняў, трылогія, цыкл палескіх раманаў, быт беларускага Палесся.

Іван Мележ нарадзіўся 8 лютага 1921 года ў сялянскай сям'і: бацька – Павел Фёдаравіч, маці – Марыя Дзянісаўна. У 1938 годзе з адзнакай скончыў школу ў Хойніках, працаваў у Хойніцкім райкаме камсамола. У 1939 годзе паступіў у Маскоўскі інстытут філасофіі, літаратуры і гісторыі, на першым курсе быў прызваны ў Чырвоную Армію.

Улетку 1940 года прымаў удзел у далучэнні Бесарабіі і Букавіны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ваяваў пад Мікалаевам, Лазоваю, Растовам-на-Доне, у 1941 годзе быў паранены. У 1942 скончыў курсы палітработнікаў і быў адкамандзіраваны ў 51-ю стралковую дывізію супрацоўнікам газеты.

Пасля паўторнага ранення Мележ быў накіраваны ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, працаваў выкладчыкам ваеннай падрыхтоўкі.

У 1945 годзе Іван Мележ завочна скончыў філалагічны факультэт БДУ, паступіў у аспірантуру. Адначасова з вучобай працаваў у рэдакцыі часопіса “Полымя”. Пасля заканчэння аспірантуры працаваў у БДУ старшым выкладчыкам беларускай літаратуры, а таксама ў рэдакцыі літаратурнага часопіса «Полымя», знаходзіўся ў апараце ЦК КПБ.

З 1966 года сакратар, у 1971–1974 гадах намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1967–1976 гг.). Быў старшынёй праўлення Беларускага аддзялення Таварыства “СССР-Францыя”, старшынёй Беларускага Камітэта абароны міру, членам Сусветнага савета міру.

У 1973 годзе Іван Мележ падпісаў Ліст групы савецкіх пісьменнікаў пра Салжаніцына і Сахарава.

Хоць яго цяпер і няма ў жывых, але ён пакінуў шмат вядомых твораў, якія актыўна вывучаюцца ў школах і іншых адукацыйных установах.

У 1939 г. быў апублікаваны першы верш Івана Мележа “Радзіме”. Перад вайной яго вершы друкаваліся ў газетах “Літаратура і мастацтва”, “Бальшавік Палесся”, у 1943 годзе ў “Бугурусланскай праўдзе”.

Першыя апавяданні ён напісаў у Тбіліскім шпіталі. У 1945 годзе ў газеце “Звязда” выйшла яго апавяданне “Сустрэча ў шпіталі”. У 1946 годзе выдадзены першы зборнік апавяданняў “У завіруху”, у 1948 годзе – другі зборнік прозы “Гарачы жнівень”. Іван Мележ – аўтар рамана “Мінскі напрамак” (аб Вялікай Айчыннай вайне і пасляваенным перыядзе), зборнікаў прозы “Блізкае і далекае”, “У гарах дажджы”, “Што ён за чалавек”. Ён спрабаваў сябе і ў драматургіі, часцей за іншых ставілася п'еса “Пакуль вы маладыя”.

Цэнтральнае месца ў творчасці Івана Мележа займае трылогія “Палеская хроніка” (“Людзі на балоце”, “Подых навальніцы”, “Завеі, снежань”), дзеянне якой адбываецца ў родных для пісьменніка месцах. У ёй апісана жыццё палескай вёскі 1920–1930-х гадоў – цяжкасці пераходу да сацыялізму, калектывізацыя, раскулачванне.

Можна было б доўга і падрабязна разбіраць яго творчасць і ўсе яго творы, зборнікі, пъесы, але прапаную падрабязней разгледзець яго самую вядомую трылогію (“Палеская хроніка”), а дакладней, адну яе частку – “Людзі на балоце”.

Раман з'яўляецца самым значным мастацкім творам Івана Мележа. Ён пераведзены на мноства моў. Гэтым творам Мележ зрабіў вялікі і каштоўны ўклад у нацыянальную беларускую літаратуру. Працаваць над цыклам “Палеская хроніка” аўтар пачаў у 1956 годзе, аднак абдумваў напісанне кнігі ён даволі даўно. У 1961 годзе “Людзі на балоце”, якія адкрываюць цыкл палескіх раманаў, выйшлі з друку.

1920 гады, Усходняя Беларусь, нялёгкія пасляваенныя гады і станаўленне савецкай улады – але палітыка мала хвалюе палешукоў. Жыхары Куранёў шмат і цяжка працуюць і актыўна абмяркоўваюць

любое, нават самае дробнае здарэнне, а яшчэ ўлюбляюцца …. “Людзі на балоце” – раман пра жыхароў глухой вёсачкі Курані, адрэзанай ад знешняга свету непраходнымі палескімі балотамі.

Івана Мележа больш за ўсе прыцягвае штодзеннае жыцце куранеўцаў, тое, знешне няяркае, шэрае, з чаго па сутнасці і складаецца жыццё тысяч і мільёнаў людзей, моцна прывязаных да зямлі. З амаль этнаграфічнай дакладнасцю адноўлены ў рамане быт беларускага Палесся. Перад намі – нібы замкнуты ў сабе, звычайны вясковы свет, дзе свае нацыянальныя традыцыі, паданні і павер'і, зімовыя дзявочыя пасядзелкі, ігрышчы з песнямі, калядная варажба і хаджэнне з “казой” – гэта і многае іншае натуральна і свабодна ўвайшло ў раман. “Людзі на балоце” І. Мележ пачаў як твор лірычны і называў яго “лірычным раманам”. Лёс і драма жыцця і кахання Васіля Дзятла і Ганны індывідуальныя, глыбока народныя; і астатнія вобразы паказаны ва ўсёй іх складанасці, глыбіні і непаўторнасці, яны сцвярджаюць чалавечнасць у чалавеку.

Раман уваходзіць у залаты фонд шэдэўраў сусветнай прозы ХХ стагоддзя.

Іван Паўлавіч Мележ – гэта мастак празаічнага слова ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя, які атрымаў шырокае прызнанне не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі.

1. Воюш, І. Жаночы характар у творчасці Івана Мележа / І. Воюш // Полымя. – 2003. – № 3.– С. 191–209.

2. Гніламёдаў, У.В. Іван Мележ: нарыс жыцця і творчасці : раман, апавяданні, нататкі / У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Нар. асвета, 1984. – 128 с.

3. Мележ, І. Выбраныя творы / І. Мележ; уклад., прадм. і камент. С. Андраюка. – Мінск: Беллітфонд, 2001. – 576 с.

4. Навуменка, І.Я. Іван Мележ / І.Я. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. – Мінск, 1999–2014. – Т. 3: 1941–1965. – 2002. – С. 574–596.

**УДК 811.161.3**

## СВЕТ РОДНОЙ МОВЫ, АБУДЖАНЫ І НАТХНЁНЫ СКАРЫНАМ

*Студэнты – Белазаровіч М.С., 1 мс, 1 курс, ІТФ;*
*Васілюк М.В., 44 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаецца мова перакладаў і прадмоў Ф. Скарыны, аналізуюцца асаблівасці беларускай мовы. Тэксты асобных прадмоў да Святога Пісання прасякгнуты любоўю да роднай мовы.